**ПАРОНІМЫ**, словы, якія часткова супадаюць па марфемнай структуры і маюць аднолькавыя граматычныя характарыстыкі. Могуць адрозніваўца сугучнымі суфіксамі («тынк» – «тынкоўка», «каласавы» – «каласісты»), прэфіксамі («абвестка» – «павестка», «асвоіць» – «засвоіць»), асобнымі фанемамі ў каранях («дыскант» – «дысконт», «квадра» – «кварта») і інш. Найбольш часта паранімічныя адносіны ўзнікаюць паміж назоўнікамі, прыметнікамі, радзей – дзеясловамі. П., як правіла, характарызуюцца сэнсавай суадноснасцю («лазурак» светла-блакітны колер – «лазурыт» мінерал цёмна-сіняга колеру). Ад П. адрозніваюцца паранамазы – структурна блізкія, але семантычна розныя словы, якія пры ўключэнні ў адзін кантэкст прадстаўляюць стылістычны прыём – паранамазію («Дамавіты, дымавіты, смаляны // дужы дух паблытаў вольна долы…» Р.Барадулін).

*Д.В.Дзятко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ